**29-га ЛІСТАПАДА г.г. ДЛЯ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА — ЮБІЛЕЙНАЯ ДАТА. 10 ГАДОЎ ТАМУ НАЗАД У ГЭТЫ ДЗЕНЬ САВЕТ МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР ПРЫНЯЎ ПАСТАНОВУ АБ ПРЫСВАЕННІ ГДУ ІМЯ БЕЛАРУСКАГА ПЕРШАДРУКАРА, СЛАВУТАГА ВУЧОНАГА І АСВЕТНІКА ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ**

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 17(955) | АЎТОРАК, 24 лістапада 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ПА ПРАБЛЕМАХ РЭГІЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ



*На здымку: у цэнтры — міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І.Стражаў, злева -- прэзідэнт Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы В.Я.Шукшуноў, справа -- рэктар ГДУ Л.А.Шаматкоў у час пасяджэння акадэмікаў названай акадэміі.*

*Фота У.ЧЫСЦІКА.*

Гэта тэма абмеркавана акадэмікамі Беларускага аддзялення Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы. Іх пасяджэнне, якое адкрыў і вёў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь В.І.Стражаў, адбылося ў нашым універсітэце.

З дакладамі выступілі рэктары: ГДУ -- член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шаматкоў, Гродзенскага імя Я.Купалы і Полацкага дзяржаўных універсітэтаў прафесары С.А.Маскевіч і Э.М.Бабенка. Яны падрабязна расказалі аб жыццядзейнасці ўзначальваемых імі і іншымі рэгіянальных ВНУ. З поля зроку прамоўцаў не была ўпушчана ні адна праблема вышэйшай школы, якая патрабуе неадкладнага вырашэння. Гаворка ішла пра паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэтаў, акадэмій і інстытутаў, недастатковае іх фінансаванне, падрыхтоўку навуковых кадраў, забеспячэнне іх матэрыяльнай зацікаўленасці, пашырэнне і ўмацаванне міжнародных сувязей, вывучэнне і рэалізацыю заказаў на маладых спецыялістаў. Больш дасканалым павінен стаць набор студэнтаў як на дзяржаўнай, так і платнай асновах.

Пры абмеркаванні заслуханых дакладаў шмат слушных прапаноў выказана рэктарам Мінскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка, членам верхняй палаты парламента нашай краіны Л.Н.Ціханавым, Беларускага дзяржаўнага універсітэта радыёэлектронікі і інфарматыкі В.М.Ільіным і іншымі ўдзельнікамі пасяджэння.

З вялікай цікавасцю было выслухана выступленне рэктара Чарнігаўскага інстытута эканомікі і кіравання прафесара Б.І.Сухавірскага аб складаных праблемах вышэйшай адукацыі на Украіне. Выхад з гэтай сітуацыі ён бачыць і ў міждзяржаўных пагадненнях паміж ВНУ ў пэўных рэгіянальных маштабах. У прыватнасці, названы Чарнігаўскі інстытут зацікаўлены ва ўстанаўленні цесных кантактаў з Гомельскім дзяржуніверсітэтам.

Па выніках абмеркаваных праблем для іх паспяховага вырашэння прынята адпаведная пастанова.

У рабоце пасяджэння Беларускага аддзялення Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы прыняў удзел яе прэзідэнт прафесар В.Я.Шукшуноў (Масква), які ў гэты ж дзень сустрэўся з дэканамі і загадчыкамі кафедр ГДУ і расказаў аб стане вышэйшай адукацыі ў Расіі, і намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкома В.С.Ахлесцін.

**Ул.БАЛОГА.**

**ПРАФЕСАРУ ГАЭТАНА БАРЛЕТА З ІТАЛІІ, ЯКІ НА ПРАЦЯГУ 5 ГАДОЎ ПЛЁННА СУПРАЦОЎНІЧАЕ З НАШАЙ ВНУ, НА ЎРАЧЫСТЫМ ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА ПРЫСУДЖАНА ГАНАРОВАЯ СТУПЕНЬ ДОКТАРА ПСІХАЛОГІІ; ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ АДКРЫЛАСЯ ЛАБАРАТОРЫЯ ПРАКТЫЧНАЙ ПСІХАЛОГІІ.**

**/Аб гэтых падзеях больш падрабязна чытайце ў наступным нумары нашай газеты./**

*Міжнародная канферэнцыя*

## НАРОШЧВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ НАВУКІ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

Наш універсітэт пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь правёў міжнародную канферэнцыю "Вылічальныя метады і вытворчасць: рэальнасць, праблемы, перспектывы". У яе рабоце прынялі ўдзел арганізатары навуковага форуму, вучоныя і аспіранты Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы.

На пленарнам пасяджэнні заслуханы даклады рэктара ГДУ, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, прафесара Л.А.Шаматкова, доктара тэхнічных навук, прафесара Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута Я.А.Хетагурава, загадчыкаў кафедр матэматычнага факультэта вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся, дактароў навук, прафесараў І.В.Максімея і В.В.Мажароўскага.

На канферэнцыі працавалі секцыі: "Камп'ютэрныя тэхналогіі ў навуцы і вытворчасці", "Вылічальныя метады і іх прымяненне", "Матэматычныя метады ў прыкладных навуках", "Сучасная алгебра і праблемы яе камп'ютэрызацыі".

Пры падвядзенні вынікаў работы канферэнцыі асаблівая ўвага звернута на тое, што сучасная матэматычная навука павінна ўносіць больш важкі ўклад у стабілізацыю айчынных галін народнай гаспадаркі і іх эканоміку.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

*З III Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія" Гомель' 98*

## МОВА МАСТАЦТВА ЗРАЗУМЕЛАЯ ЎСІМ

Сур'ёзным і вясёлым адначасова, шумным, гаманлівым выдаўся тыдзень універсітэцкага жыцця з 4 па 10 лістапада. У нашай ВНУ ўладарыў фестываль "Арт-сесія", які цяпер ужо мае сваю пакуль не вялікую, але ўсё ж гісторыю: трэці па ліку (I і II праходзілі тут у 1994 і 1996 гадах), ён атрымаўся самым шырокамаштабным і прадстаўнічым. У ім прымалі ўдзел 14 творчых калектываў з сямі краін далёкага і блізкага замежжа -- Германіі, Даніі, Францыі, Шатландыі, Індыі, Расіі, Украіны. Прыехалі ў Гомель і нашы беларускія артысты з Мінска і Баранавіч.



*Парад удзельнікаў фестывалю.*

*Фота У.ЧЫСЦІКА.*

Сёлета фестываль "узялі пад сваё крыло" Дзяржаўны камітэт па справах моладзі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі краіны, абласны і гарадскі выканаўчыя камітэты, абласны камітэт Саюза Моладзі Беларусі і абласны камітэт Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.

Узначальваў аргкамітэт фестывалю намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкома В.С.Ахлесцін, які выступіў на ўрачыстым яго адкрыцці ў аблдрамтэатры, на сцэне актавай залы ГДУ, калі свята мастацтва завяршалася. Прыняў удзел у закрыцці фестывалю старшыня Дзяржкамітэта па справах моладзі РБ А.Р.Пазняк.

Адчувалася шчырая зацікаўленасць мясцовых улад да развіцця шырокага культурнага абмену паміж нашым абласным цэнтрам, яго вышэйшымі навучальнымі ўстановамі з краінамі, якія прыслалі сваіх прадстаўнікоў на гэты міжнародны фестываль, асабліва з гарадамі-пабрацімамі Францыі і Шатландыі -- Клермон-Феранам і Абердзінам. Гэта падкрэслівалася і ў час прыёму ўдзельнікаў фестывалю мэрам горада А.С.Якабсонам.

Шмат сіл, і фізічных, і маральных, укладзена ў арганізацыю і правядзенне фестывалю яго ініцыятарам -- культурным цэнтрам ГДУ, яго памочнікамі-валанцёрамі з ліку студэнтаў універсітэта, усімі тымі, хто тэхнічна абслугоўваў шматлікія канцэртныя праграмы гэтага маляўнічага і цікавага відовішча.

У дні "Арт-сесіі" адбылося шмат канцэртаў не толькі на сцэне актавай залы ГДУ, але і ў іншых ВНУ г.Гомеля. Як

(ЗАКАНЧЭННЕ на 2-й стар.)

*Вынікі конкурсу*

## ДЛЯ ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Журы V конкурсу навукова-папулярных выданняў па экалогіі Беларусі падвяло вынікі папулярызацыі прыродаахоўных праблем у друку за 1997 год. Старшыня журы член-карэспандэнт Нацыянальнай АН Рэспублікі Беларусь М.М.Пікулік адзначыў, што беларускія вучоныя, пісьменнікі, журналісты, работнікі рэдакцый многіх газет, часопісаў і выдавецтваў, нягледзячы на сур'ёзныя аб'ектыўныя цяжкасці, працягваюць дастаткова поўна і эфектыўна асвятляць экалагічныя праблемы нашай рэспублікі.

Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаны ў шасці намінацыях. У адной з іх - "Публікацыі дзяцей і для дзяцей" -- другое месца прысуджана дацэнту геолага-геаграфічнага факультэта нашага універсітэта кандыдату біялагічных навук Л.П.Моладавай за кнігу "Экалагічныя святы для дзяцей". Яе аўтар удастоена Дыплома II ступені і грашовай прэміі. Дарэчы, такога поспеху ў традыцыйным конкурсе яна дасягнула ў другі раз запар.

З III Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія" Гомель' 98

# МОВА МАСТАЦТВА ЗРАЗУМЕЛАЯ ЎСІМ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 1-й стар.)

жаданых гасцей цёпла сустракалі розныя творчыя калектывы ў іншых гарадах вобласці -- Мазыры, Жлобіне, Добрушы, Рэчыцы і Ветцы.

А самае каштоўнае тое, што фестываль выканаў сваю галоўную задачу, якая заключаецца ў актывізацыі і развіцці талентаў моладзі, прапагандзе народнай творчасці розных краін, пашырэнні культурных міжнародных сувязяў.

Лаўрэаты фестывалю ўзнагароджаны дыпломамі і памятнымі падарункамі. Сярод лаўрэатаў і пяць творчых калектываў культурнага цэнтра ГДУ: народная харавая капэла "Дзянніца" (кіраўнік М.Казлоў), народны фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Радзімічы" (А.Лысянкоў), ансамбль народнай музыкі "Скарб" (А.Гулай), тэатр фальклорнай песні "Пасад" (В.Драмук), тэатр танца "Кактэйль" (Я.Зарайскі).

Расказаць падрабязна аб усіх калектывах, якія дэманстравалі сваё выканаўчае майстэрства на "Арт-сесіі", проста немагчыма. Засяродзім увагу чытачоў на нашых гасцях, тых калектывах, якіх гледачы прымалі з найбольшай цеплынёй і прыхільнасцю.

Такім чынам, сем знаёмстваў:

## Госці здалёку

У самым поўным сэнсе слова "заводзіў залу" аркестр папулярнай танцавальнай музыкі "Tne Favourite Geilidh Dance Band" з Даніі (г.Капенгаген). 12 чалавек утвараюць фолк-рок-групу, якая выконвае як уласныя творы, так і традыцыйную музыку ў арыгінальнай аранжыроўцы, дзе арганічна спалучаюцца ірландскія і шатландскія народныя



мелодыі, элементы рок-музыкі. Іх кампазіцыі былі прасякнуты рухам і энергіяй, што рабіла групу вельмі жывой, дынамічнай. Мастацкі кіраўнік калектыву Міхаэль Скот выглядаў на сцэне нібыта вечны рухавік, які не даваў гледачу засумаваць. І публіка прымала выступленні датчанаў "на ўра!".

Вельмі каларытнай выглядала яшчэ адна не менш цікавая група з Шатландыі, з г.Абердзіна -- "Drop The Box". Іх музыка, лірычная і дынамічная адначасова, здавалася, вяла за сабой у далёкую і невядомую краіну, каб мы душой адчулі яе прыгажосць. Акардэаністка І.Томсан, жывая, абаяльная, як і тыя мелодыі, што гучалі ў яе выкананні ва ўнісон з гітарамі, скрыпкай і ўдарнымі інструментамі, выклікала шмат апладысментаў у зале. Удзельнікі групы -- былыя студэнты Абердзінскага універсітэта -- зараз вельмі папулярныя не толькі ў сябе на радзіме, але і ў Францыі, Канадзе, Ірландыі.



Прафесіяналамі вышэйшага "гатунку" паказалі сябе на фестывалі ўдзельнікі квартэта трамбаністаў кансерваторыі імя Шабр'е з Клермон-Ферана. Яны -- толькі частка вялікага аркестра трамбаністаў горада-пабраціма. Іх творчасцю захапляліся жыхары Шатландыі, Швейцарыі, Германіі.

## "Белыя брыльянты"

Так называўся калектыў, які прыехаў на фестываль з Германіі. Музыканты групы прыцягнулі да сябе асаблівую ўвагу яшчэ да афіцыйнага адкрыцця "Арт-сесіі" на канцэрце, які прайшоў у выставачнай зале нашага універсітэта. Самі яны называюць напрамак, у якім працуюць, "сусветным джазам", бо выконваемая імі музыка -- гэта своеасаблівае спалучэнне сучаснага джаза і веянняў еўрапейскай, балканскай і індыйскай музыкі.

А надзвычайная адметнасць калектыву ў тым, што ў яго складзе -- індыйскі музыкант Удаі Мазумдар. Гледачам ён спадабаўся як сапраўдны







майстар ігры на табле -- індыйскім барабане. Ён настолькі памайстэрску валодаў ёй, што, здавалася, табла стала часткай музычнага цэлага на сцэне. Спалучэнне джаза і рытма таблы стварала ўражанне арыгінальнага музычнага спектакля. У.Мазумдар быў удзельнікам Міжнароднага фальклорнага фестывалю ў Венгрыі, Міжнароднага фестывалю барабанаў у Германіі, фестывалю сусветнай музыкі ў Рыме.

## З глыбіні стагоддзяў

... Заплюшчыш на імгненне вочы і, здаецца, ты -- у старажытным замку, з яго велічнымі мураваннямі, а з партрэтаў на сцэне строга глядзяць на цябе былыя гаспадары гэтага цуда-палаца. А музыка кліча, вядзе за сабой туды, у вялікую і прыгожую залу, дзе танцуюць менуэт, паланез і гавот грацыёзныя паненкі і сур'ёзныя кавалеры.

Такія асацыяцыі нараджаліся пад час канцэрта ансамбля старажытнай музыкі "Контрданс". У першую чаргу, сярод іншых калектываў яго вылучалі строгія чорныя касцюмы ў стылі XVI-XVII стагоддзяў,



што ўжо само па сабе стварала ў публікі вытанчанае ўспрыняцце Вялікай Музыкі. Гучанне ансамбля, такое пяшчотнае і ўражлівае, закранала нешта самае патаемнае ў душы кожнага слухача.

Гэты калектыў, які складаецца з выкладчыкаў дзіцячай музычнай школы г.Баранавічы (кіраўнік А.Канстанцінаў) -- па-свойму унікальны і адзіны ў нашай рэспубліцы. У яго рэпертуары -- старажытныя еўрапейскія танцы XVI -XVIII стагоддзяў. Інструменты (флейты, клавесін, гітара, ударныя) выраблены па чарцяжах XIV ст. у Германіі, у г.Гановеры, з абшчынай Новаапостальскай царквы якога музыканты з Баранавіч маюць даўнія творчыя сувязі. Старажытныя ноты яны шукаюць і знаходзяць у бібліятэках, выкарыстоўваюць таксама творы кампазітараў І.С.Баха, Ф.Гендэля, В.Моцарта, Д.Скарлаці і невядомых беларускіх аўтараў XVI ст.

## Незвычайны дэбют

Іх на дзіва прыгожыя і чыстыя галасы зачароўвалі. "Купалінка, Купалінка, цёмная ночка..." -- гучала ў выкананні артыстаў з Расіі на выдатнай беларускай мове. Мужчынскі фальклорны ансамбль "Мурама" (г.Мурам, кіраўнік А.Чэрнікаў) спецыяльна да свайго заключнага выступлення на фестывалі развучыў гэтую беларускую песню, каб зрабіць гледачам такі своеасаблівы падарунак. І дэбют быў паспяховым.

А потым зала ўзрывалася бурнымі апладысментамі, дружным смехам, калі ў выкананні мурамчан гучалі са сцэны рускія народныя, лірычныя песні, жартоўныя прыпеўкі. Адчуваўся высокі



прафесіяналізм калектыву, які быў удзельнікам Міжнароднага фестывалю фальклору ў Францыі, Тунісе, з'яўляецца ўладальнікам Гран-пры міжнародных конкурсаў выканаўцаў народнай песні.

## І галасоў цудоўнае гучанне...

Па колькасці ўдзельнікаў гэты калектыў быў на фестывалі самым прадстаўнічым. Харавая капэла "Мара" Беларускага універсітэта культуры, у якую ўваходзяць студэнты кафедры харавога мастацтва факультэта мастацкай творчасці, заваявала шмат сімпатый гледачоў. У іх выдатным выкананні гучалі творы беларускіх , рускіх і замежных кампазітараў. Асабліва цёпла прымала публіка жартоўную мексіканскую народную песню "Кукарача".

Калектыў з'яўляецца лаўрэатам III Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі. Кіруюць ім заслужаны работнік адукацыі рэспублікі, прафесар А.В.Пякуцька і заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь,



прафесар Я.М.Рэўтовіч.

***

***Гэтыя сем кароткіх знаёмстваў -- толькі нязначная часцінка таго вялікага мастацкага дзеяння, якое разгортвалася ў дні "Арт-сесіі". Але і яны, думаецца, змаглі скласці ў чытачой газеты, у тых, хто на канцэрты на тых або іншых прычынах не трапіў, перакананне, што творчы ўзровень III Міжнароднага фестывалю быў дастаткова высокім.***

Т.ДУБЯК.

Фота У.ЧЫСЦІКА.

Кнігі нашых вучоных

# НА НІВЕ СУПОЛЬНАСЦІ




Пільную ўвагу сёння выклікаюць старонкі мінуўшчыны. Навуковым экскурсам у дні мінулыя з'яўляецца і манаграфія Міколы Воінава «Плён супольнасці», якая нядаўна ўбачыла свет у выдавецтве «Беларуская навука». Галоўная праблема даследавання — мастацкі пераклад і развіццё беларускай літаратуры на памежжы XIX — XX стагоддзяў. Аўтар, спрабуючы асэнсаваць складаны рух станаўлення розных літаратурных жанраў і вызначыць часавыя межы пэўных перыядаў, зазначае: «Новая беларуская літаратура ўзнікла на мяжы двух стагоддзяў. Таму сваімі вытокамі яна ўзыходзіць да эпохі А.Пушкіна, М.Лермантава, Т.Шаўчэнкі, А.Міцкевіча, В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча...». Гэтая выснова блізкая да сцвярджэння вядучых літаратуразнаўцаў Бугаёва, Гніламёдава, Грынчыка, Івашына, Каваленкі, Конана, Лазарука, Лойкі, Мальдзіса, Мушынскага, Навуменкі пра найбольш вызначальныя моманты, часавыя адрэзкі фарміравання нашай літаратуры ў новых умовах.

Спасцігаючы спецыфіку фарміравання творчых асоб, мастацкую непаўторнасць майстроў слова, аўтар слушна зазначае: «Творчыя пошукі маладой нацыянальнай літаратуры адбываліся ў агульным рэчышчы сусветнага літаратурнага працэсу...» (раздзел «Асаблівасці літаратурнага працэсу канца XIX — пачатку XX ст.). Гэта перыяд, пра які М.Багдановіч пісаў як пра час паскоранага развіцця нашай літаратуры, якой было суджана за кароткі гістарычны прамежак прайсці той шлях, на які іншым літаратурам былі шчодра адведзены многія дзесяцігоддзі.

Даследуючы нацыянальны літпрацэс, аўтар не абмяжоўваецца выключна ідэйна-сацыяльнымі аспектамі, ён спрабуе (і досыць пераканаўча) разгледзець асаблівасці мастацкага метаду, яго дыялектыку, вызначае эстэтычную прыроду твора. Пры гэтым ён паказвае той шырокі фон тагачаснага еўрапейскага літаратурнага жыцця, які не мог не ўплываць на эвалюцыю літаратурнага руху ў Беларусі. У першую чаргу, несумненна, тут найбольш важнымі былі кантакты з вопытам суседзяў—славян: рускіх, украінцаў, палякаў.

Аргументуючы свае высновы, М.Воінаў, як правіла, не імкнецца да празмернай катэгарычнасці, безапеляцыйнасці. Наадварот, дзе-нідзе ён знарок ці інтуітыўна пакідае прастору для сваіх апанентаў, даючы ім магчымасць не толькі дапоўніць, дакарэкціраваць і развіць свае назіранні, але і выявіць у нечым істотны іншы ракурс асвятлення пэўнай з'явы, мастацкай тэндэнцыі.

Істотная асаблівасць кнігі «Плён супольнасці» — шчыльны сінтэз тэарэтычнага аналізу, спецыфічнага літаратуразнаўчага разгляду з канкрэтнай часовай, грамадскай і культурнай сітуацыяй, з пульсам рэчаіснасці. Гэта надае працы добрую асветніцкую якасць, робіць яе зразумелай шырокаму чытачу, усім, хто не абыякавы да нашай гісторыі, хто ўсур'ёз цікавіцца культурай Айчыны, летапісам нацыянальнага абуджэння.

Характарыстыка літаратурнага жыцця ў Беларусі на пачатку гэтага стагоддзя вызначаецца дакладнасцю інфармацыйнай фактуры, адсутнасцю псеўдапатрыятызму і рамантычна-экзальтаванай адыёзнасці. Як з маленькіх ручаін пітуецца імклівая рачная плынь, так з паасобных твораў узнікла «краса і сіла» (М.Багдановіч) новай літаратуры. Узнікла няпроста — з перашкодамі і рэцыдывамі нацыянальнага нігілізму, бо перш, чым стварыць высокаразвітую літаратуру, беларускаму народу трэба было прайсці цяжкія ўмовы гістарычнага развіцця, змагацца за права называцца народам, мець уласную літаратурную мову, аднавіць страчаную дзяржаўнасць. Аўтар нікольки не перабольшвае, калі гаворыць: «Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. канчаткова замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй нашага народа тэрмін «Беларусь». Аднак сама назва «беларусы» не набыла ў той час выразнага агульнацыянальнага зместу. Поруч з ёй ужываліся канфесіяналізмы «рускія» і «палякі», адпаведна падзелу на праваслаўных і католікаў, а часта сярод насельніцтва, нават у другім дзесяцігоддзі XX ст. вялася палеміка наконт гэтага пытання». Не выпадкова аўтар спасылаецца і на рэмарку Я.Брыля: «Беднасць наша, кволы пачатак, калі і пераклад апавядання Гаршына «Сігнал» строга ўлічваецца гісторыяй літаратуры».

Прыход у літаратуру Купалы, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага і іншых істотным чынам змяняе незайздросную сітуацыю. Пра якасна іншы ўзровень твораў, пра істотнае пашырэнне жанравых абсягаў роднай літаратуры — у раздзелах «Мастацкі пераклад і ўзаемадзеянне літаратур», «Перакладчыцкае майстэрства Янкі Купалы» і «Максім Багдановіч — перакладчык сусветнай паэзіі». І тут нельга аспрэчыць доказнае сцвярджэнне аўтара: «У працэсе паскоранага развіцця беларускай літаратуры, выхаду яе з нацыянальнай абмежаванасці немалаважную ролю адыграў мастацкі пераклад як найбольш дзейсная форма міжлітаратурных узаемасувязей». Цікавыя тут для разумення дынамікі айчыннай культуры і статыстычныя звесткі. Калі, напрыклад, у XIX стагоддзі было ўвогуле выдадзена на беларускай мове 38 кніг, то ў 1900 - 1916 гадах — 191.

Прыводзячы важкія факты фарміравання ў Беларусі мастацкага перакладу ў другой палове мінулага стагоддзя, даследчык з поўнай на тое падставай лічыць, што сапраўдны росквіт у гэтай дзейнасці прыпадае на XX ст., багатае на плённыя здабыткі.

У сваіх развагах і вывадах літаратуразнаўца не толькі спасылаецца на метадалогію такіх аўтарытэтных даследчыкаў у галіне мастацкага перакладу як Рагойша і Яскевіч, але ўлічвае і ўласны шматгадовы вопыт. Не выпадкова ў шэрагу папярэдніх прац аўтара закрануты такія тэмы: «Пераклад на сучасную беларускую мову «Слова пра паход Ігаравы», «Пушкін і Лермантаў у перакладах Куляшова», «Творчае пабрацімства беларускіх і ўкраінскіх паэтаў», «Куляшоў і Твардоўскі». Такім чынам аўтар манаграфіі далёка не навічок у вырашэнні абранай ім навуковай задачы. Пацвярджэннем шматграннага асэнсавання мастацкага матэрыялу — і аналіз здабыткаў на ніве перакладу Купалы і Багдановіча. Менавіта з гэтымі імёнамі і звязаны новы этап не толькі ў справе перакладу, але і ў якасным росце ўсёй нашай літаратуры. Прасочваючы лініі перасячэння агульных мастацкіх сімпатый, пошукаў і навацый майстроў слова самых розных народаў, як блізкіх, так і аддаленых, даследчык тым самым сцвярджае ідэю людской роднасці і гуманістычных каштоўнасцей. Заўсёды, і асабліва ў моманты абвастрэння міжнацыянальных адносін, гэта зусім немалаважна.

І зусім апраўдана ў кнізе Міколы Воінава тое, што спецыфічныя навуковыя пытанні арганічна яднаюцца з грамадскімі тэмамі сучаснасці, сярод якіх праблема ўзаемаразумення — адна з найгалоўнейшых. Добрым прыкладам плённай узаемапавагі між прадстаўнікамі на карысць шырокіх творчых кантактаў, узорам глыбокага спасціжэння класічнай еўрапейскай спадчыны служыць і беларуская літаратура на мяжы XIX — XX стагоддзяў. На карысць гэтай думкі — шмат грунтоўных пацвярджэнняў у кнізе «Плён супольнасці».

**В.ЯРАЦ,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі, дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

*10 ГАДОЎ З ІМЕМ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ*

# СІМВОЛІКА ГРАВЮРЫ Ф.СКАРЫНЫ

Шматгранная спадчына Ф.Скарыны нагадвае невычэрпную крыніцу жывой вады, якая поіць творчае натхненне, духоўна ўзбагачае не адно пакаленне вучоных, пісьменнікаў і простых людзей. У гэтым пераконваешся кожны раз, калі ўнікаеш у яе глыбінную сутнасць.

Колькі ўжо напісана хоць бы пра тую ж ксілаграфію (ксілаграфія -- гравюра на дрэве) з партрэтам Ф.Скарыны, змешчаную на 82-ім лісце кнігі "Ісус Сірахаў" 1917 года выдання. Але яна працягвае здзіўляць багаццем нязведанага, загадкавасцю сімволікі. Кожная навуковая публікацыя пра вынікі даследавання гэтай ксілаграфіі дабаўляе ўсё новыя і новыя штрыхі, бліжэй падводзіць нас да поўнага і правільнага ведання ўсіх яе элементаў. Хочацца падзяліцца і сваімі знаходкамі ў надзеі, што яны хоць на кропельку наблізяць нас да поўнай і правільнай ацэнкі гэтай самай, бадай, важнай ксілаграфіі Ф.Скарыны.

Зверху і знізу пасярэдзіне яе гарызантальных ліній знаходзяцца, як сцвярджаецца ў энцыклапедычным даведку "Ф.Скарына і яго час", таблічкі. На самой справе -- гэта аспідныя дошкі, якія прызначаліся ў тую эпоху для навучання пісьму. Іх насілі на баку, прывязанымі за адну з пяцель. Дошкі адлюстроўвалі ў жывапісных і графічных палотнах аж да XIX ст. Паколькі яны даўно перасталі ўжывацца ў практыцы навучання, на іх забыліся. Змяшчаючы адлюстраванні гэтых дошак на ксілаграфіі, Скарына выражаў адукацыйную накіраванасць сваіх кніг.

У сучаснай скарыназнаўчай літаратуры сцвярджаецца, што другі цікавы элемент гравюры -- калоны на заднім плане, за Скарынам, -- трыумфальная арка. На нашу ж думку -- гэта ўваход у рай, ці божы горад (райскую альтанку). Медыявістам (спецыялістам па сярэдніх вяках) добра знаёмы адлюстраванні раю, што сустракаюцца ў выяўленчым мастацтве ў выглядзе альтанкі, абвітай кветкамі ці зялёнымі галінкамі (тут дубовымі). Каля гэтага збудавання ў верхняй частцы злева размешчана армілярная сфера (старажытны зорны глобус) на фоне неба. Яна ўзмацняе сімвал райскай альтанкі. Усё гэта разам можна расшыфраваць так: адукацыя, навука ўзняла Ф.Скарыну да ўваходу ў райскае жыццё на зямлі; дапаўняе шматкратна паўтораную Ф.Скарынам ісціну, што "адукаваны чалавек мае ў галаве сваёй вочы, а неадукаваны ў цемры ходзіць".

Самым цікавым, загадкавым і спрэчным ва ўсёй ксілаграфіі з'яўляецца, на нашу думку, прысутнасць тут выяў двух ільвоў з геральдычнымі знакамі. Па ранейшых версіях правы знак сімвалізаваў друкарскі станок. Візантыйскае і балгарскае сярэднявечнае мастацтва пераконвае, што гэта графічнае стылізаванае адлюстраванне сімвала Галгофы (узгорка каля Іерусаліма, які лічыцца месцам пакут, нягод у сувязі з тым, што на ім, як сцвярджаецца хрысціянскім веравучэннем, быў распяты Хрыстос). Адлюстраванне ўяўляе сабой схематычны малюнак узгорка з пляцоўкай наверсе, на якой стаяць у цэнтры крыж, а па баках -- два кап'і. На якасных рэпрадукцыях гэтай ксілаграфіі відаць вастрыі коп'яў. Часцей за ўсё такая схематычная выява Галгофы сустракаецца на верхняй вопратцы манахаў і іншых служак культу, адлюстраваных на старажытных іконах.

Леў у тыя часы з'яўляўся сімвалам аднаго з чатырох евангелістаў -- святога Марка. Падтэкст гэтай выявы сцвярджае, што Ф.Скарына выступае новым евангелістам — настаўнікам простых людзей, аўтарам і выдаўцом падручнікаў для іх.

Левая выява льва сімвалізуе святога Іераніма, аўтара кананічнага перакладу



Бібліі на лацінскую мову -- так званай Вульгаты. Выкарыстанне гэтага сімвала пацвярджае, што для сваіх перакладаў Ф.Скарына выкарыстаў гэтую лацінскамоўную крыніцу. Значок у кіпцюрах льва -- адзін з самых складаных для разгадкі элементаў дадзенай ксілаграфіі. Ён шырока тлумачыцца як аптэкарскія вагі і звязваецца з вучонай ступенню доктара медыцыны партрэтаванай тут асобы. Іншыя даследчыкі ксілаграфіі бачаць у ім літару Б і яе адбітак у люстры. Аўтары гэтай версіі звязваюць гэта з друкарскай справай Скарыны, са спецыфікай друку (літары для наборных шрыфтоў адліваюцца ў адваротным выглядзе). Але, здаецца, сімвал гэты больш складаны, глыбокі і сур'ёзны. Ён звязаны са Старым запаветам, як знак у правага льва звязаны з Новым запаветам. Тут сапраўды асноўным элементам з'яўляецца літара, і не адна.

У старажытным выяўленчым мастацтве і літаратуры ў літары ўкладваўся важнейшы сэнс адлюстравання, яны абавязкова былі галоўнымі сімваламі. Літарная сімволіка вельмі добра вытлумачана ў кнізе Папюса "Кабала", якую ён прадстаўляе як навуку пра Бога, сусвет і чалавека (перавыдадзена на рускай мове Санкт-Пецярбургскім выдавецтвам "Андрэеў і сыны" у 1992г.)

Літара А мае тут шмат значэнняў. Скарына выбраў для сябе два -- "бацька" і "Бог". У літары Б ён выбраў значэнні "мудрасць" і "дом".

Свой партрэт на ксілаграфіі Скарына змясціў паміж двума львамі, сімваламі двух аўтараў Бібліі -- Марка і Іераніма. Гэтым самым Скарына, як ужо сцвярджалася, паставіў сябе ў адзін рад з гэтымі карыфеямі царквы, чым падкрэсліў важнасць і велічнасць той справы, якой прысвяціў сваё жыццё, -- асветы, адукацыі, развіцця творчай актыўнасці і здольнасцей яго народа. Гэта адначасова і высокая самаацэнка, якая была ўласціва ўсім вялікім грамадскім дзеячам эпохі Адраджэння.

Гравюрная кампазіцыя насычана вялікімі і каштоўнымі сімваламі, багатая на кампазіцыйныя элементы. Яна нагадвае казачны горад, прагулка па якім узвышае чалавека, прыводзіць яго да раней не зведанага, але незвычайна багатага і каштоўнага.

У самым нізе злева размешчаны карзіны, з якімі звязваюць збіранне лекавых траў, чым, нібыта, займаўся Скарына як лекар. Такія карзіны былі ў той час прыладай працы любога самага простага лекара, а не доктара медыцыны. Але ў сярэднявечным мастацтве сустракаюцца выявы святых апосталаў, якія ідуць прапагандаваць новую веру і нясуць такія карзіны, напоўненыя скруткамі з пісьмёнамі. Ці не ў гэтай якасці Скарына адлюстраваў тут карзіны? Здаецца, што ён падрыхтаваў іх для таго, каб запоўніць сваімі кнігамі, якія ён пісаў і прызначаў для лячэння людзей. Але не ад фізічных хвароб, а ад духоўнай цемнаты і невуцтва.

Агульную тэму ўзвышанага, гераічнага і іншых вышэйшых чалавечых якасцей Скарына працягвае наступным сімвалам — выявай пчалы на светлым фоне ў правым ніжнім вугле. Гэта насякомае здаўна з'яўляецца сімвалам працавітасці. Скарына дапаўняе гэту якасць бескарыслівасцю, працавітасцю на карысць іншых (працай пчалы ў большай ступені карыстаюцца людзі, чым пчала).

На сігнеце ў якасных ілюстрацыях месяц мае скарынаўскае аблічча ў профіль. Рускі гісторык літаратуры, славіст П.У.Уладзіміраў (1854-1914) і беларускі савецкі мастак Л.Ц.Баразна (1929-1972), у прыватнасці, сцвяржаюць, што партрэт Ф.Скарыны ў анфас змешчаны ў адным з ініцыялаў літары О, а ў профіль - на гравюры тытульнага ліста кнігі "Прамудрасць божая". Скарына тут не выступае ў якасці першапраходцы. Змяшчэнне аўтапартрэтаў нават у выявах святых было шырока распаўсюджана. Напрыклад, вядомы хрыстападобныя аўтапартрэты нямецкага жывапісца, гравёра, тэарэтыка мастацтва А.Дзюрэра (1471-1528) і італьянскага мастака, заснавальніка рэалістычнага напрамку ў еўрапейскім жывапісе М. Да Караваджа (1573-1610).

Ксілаграфія з партрэтам Ф.Скарыны з'яўляецца самай каштоўнай па зместу і майстэрству выканання. У ёй адлюстраваны ў сімвалічнай і алегарычнай формах увесь жыццёвы і творчы шлях Ф.Скарыны, усе яго планы і галоўныя мэты. Дадзеная ксілаграфія дапаўняе галоўны змест прадмоў і пасляслоўяў Ф.Скарыны, паказвае яго як найвялікшага вучонага, асветніка, прапагандыста і выхавальніка самых вышэйшых чалавечых якасцей.

**М.ПАЛКОЎНІЧАНКА,**
**выкладчык выяўленчага мастацтва СШ №19.**
**К.УСОВІЧ, загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

*17 ноября отмечался Международный день студентов*

# ЕСТЬ ТАКОЙ ПРАЗДНИК!

Тише, идет экзамен! Преподаватель, подозрительно похожий на Сашу Цекало, вежливым кивком головы встречает испытуемого студента:

-- Доброе утро, студент, -- говорит он. -- А знаешь ли ты, какой великий день 17 ноября? Как, ты не знаешь, студент? Это же великий Международный праздник - день студентов. В этот день все студенты выходят на улицы и пешком идут в свои ВУЗы, чтобы увидеть других студентов, которые там тоже не часто бывают. В этот день все преподаватели дарят своим студентам цветы и открытки, занятия идут по 5 минут, а переменки длятся по 45. В этот веселый праздник технички приветливо машут вслед студентам швабрами, а гардеробщицы забрасывают их номерками. Парты 17 ноября покрываются толстым-толстым слоем надписей, а за самые лучшие из них преподаватели ставят всем пятерки. А когда студенты едут домой, люди в автобусах и троллейбусах сразу видят, что это -- студенты , улыбаются и уступают им места. История этого праздника своими корнями уходит в зачетки первокурсников, а ветвями пытается дотянуться до красных и синих дипломов...

Вдруг с шумом распахивается дверь, и коллега экзаменатора, поразительно напоминающая Лолиту, входит со словами:

-- Вам звонят из министерства. Но это уже совсем другая история. Доброе утро, студент! Тяните билет.

Так не бывает? Ну да, не бывает преподавателей, похожих на кабаре-дуэт «Академия», ни цветов с открытками, ни переменок по 45 минут, но все таки... Ведь есть 17 ноября, есть праздник -- Международный день студентов.

**Н.ПОЛЕГИНА.**



*Зноў прыйшла да нас зіма.*
*Фота У.ЧЫСЦІКА.*

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

## Улыбнитесь!

На приеме врач спрашивает у пациента:

-- Что это у вас с шеей?

-- Я оглянулся посмотреть, не оглянулась ли она, чтоб посмотреть, не оглянулся ли я.

***

-- Вы не разговариваете во сне? -- спрашивает врач пациента.

-- Нет, доктор, хотя я частенько говорю, когда другие спят.

-- Это как же?

-- Я читаю лекции в университете.

***

Лозунг студентов:

«Успешно сдадим и пересдадим экзамены!»

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

**Ответы на чайнворд,** опубликованный в №16 нашей газеты за 10 ноября.

1.Гончаров. 2.Воланд. 3.Державин. 4.Пешков. 5."Вий". 6.Йог. 7.Груша. 8.Арап.

спорт спорт

# ЗАВАЯВАНЫХ ПАЗІЦЫЙ НЕ ЗДАДУЦЬ

Ізноў бліснулі майстэрствам студэнты нашага універсітэта, якія выступалі ў спаборніцтвах па паўэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю) за Кубак вобласці. Яны праходзілі ў спорткомплексе "Гомсельмаш".

Два залатыя, два сярэбраныя, чатыры бронзавыя медалі і першае агульнакаманднае месца -- такі вынік выступлення нашых сілачоў, якія прадстаўлялі Цэнтральны раён г.Гомеля.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся: майстар спорту міжнароднага класа трэцякурснік факультэта фізічнай культуры Уладзімір Гадуноў (67,5 кг) і першакурснік гэтага ж факультэта Павел Чакмароў (56 кг). Сярэбраныя медалі заваявалі майстар спорту Дзмітрый Глухотка (100 кг) -- 3 курс факультэта фізічнай культуры і Аляксей Марозаў (да 110 кг) - 2 курс гэтага ж факультэта. Бронзавыя медалі на рахунку другакурсніка Міхаіла Антропава (56 кг), першакурсніка Віктара Лосева (90 кг) -- абодва з факультэта фізічнай культуры.

Чацвёртакурснік гістарычнага факультэта Дзмітрый Струцінскі (67,5 кг) і студэнт гэтага ж курса, але матэматычнага факультэта Руслан Бародзіч (82,5 кг) таксама ўдастоены бронзавых узнагарод.

Да гэтага трэба дадаць, што зборная каманда нашага універсітэта, якую трэніруе майстар спорту, нам.дэкана па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце матэматычнага факультэта Уладзімір Галавач, ужо двойчы выйгравала спартакіяду ВНУ Беларусі. Ёсць падставы спадзявацца, што заваяваных пазіцый нашы асілкі не аддадуць нікому.

**В.МАРЧАНКА.**

# ПРЕВРАТИМ ДЕФЕКТЫ В ЭФФЕКТЫ!

**(или о «передовых технологиях», внедряемых в ГГУ им.Ф.Скорины)**

Сказать честно, порой меня разбирает неописуемая гордость от того, что я являюсь студенткой ГГУ им.Ф.Скорины. Звучит-то ведь как! Гордо, красиво! Да вот только стоит окинуть взглядом хотя бы стены некоторых корпусов (не будем конкретизировать), как гордости сразу поубавится.

Однажды, кто-то в газете «АиФ» пошутил: чтобы узнать, насколько терпелив наш народ, нужно просто-напросто закрыть все общественные туалеты. Терпение студентов нашего учебного корпуса №1 испытывается по этому поводу уже не первый год. Почему? Все очень просто.

Представьте... Начало зимы. Первый этаж. Открывая «заветную дверцу», сразу попадаешь в помещение с минусовой температурой. Стараясь не обращать внимания на противоречивые, далеко не однообразные ароматы, пробираешься к дверям родных кабинок. Лучше к той из них, на которой выведенные милой дамской ручкой полметровые буквы лаконично гласят: «люкс». Это в связи с тем, что дверь эта и открывается, и закрывается. А то еще есть и такие, которые нужно поднять с пола, войти (держа ее , родную, на руках), и как-то приперевть за собой, так как петли, на которых обычно висят нормальные двери, в общем-то практически отсутствуют. Но это еще что! Есть у нас даже двери с самооткрывающимся эффектом. Как только что-то где-то хлопает -- эта дверь плавно открывается, несмотря на то, нужно вам это в данный момент, или нет. Но и это еще не весь фокус. Интересно то, что дверцы эти (видимо, в целях экономии такого дорогостоящего материала, как фанера), хоть и доходят до пола снизу, но сверху почти до пояса открывают личность, временно пребывающую в данном заведении.

Зато на четвертом этаже двери металлические, но тоже с секретом. Там, если приглядеться, можно отчетливо увидеть обувь и даже ноги человека, занимающего помещение, т.к. дверь тоже хитро урезана, но уже снизу. Видимо, этакие хитрые приспособления нужны для того, чтобы не кричать «занято». Такой вот способ превращения явных дефектов в эффекты.

Конечно, тяжелая обстановка в стране, экономия сырья, денег и все, такое. Но мы же не просим сделать евроремонт! Хотя бы маленькие крючочки на дверях... А по большому счету хотелось бы увидеть на дверях мест общественного пользования обнадеживающую табличку с многообещающей надписью: «ремонт».

**Н. ПОЛЕГИНА, студентка I курса филологического факультета.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- матэматычных праблем кіравання -- заг.кафедры;
-- экалогіі - ст.выкладчыка;
-- бухуліку, кантролю і АГД -- ст.выкладчыка;
-- псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ - дацэнта;
-- фізіялогіі чалавека і жывёлін -- ст.выкладчыка;
-- нямецкай мовы - выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў - не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана, дацэнту кафедры ЭІ і АСК **БАГДАНАВУ Міхаілу Іванавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры "Крэдыт і фінансы" **КОБРЫНСКАМУ Рыгору Яфімавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку кафедры агульнай фізікі, намесніку дэкана па выхаваўчай рабоце **ЖАЛОНКІНАЙ Тамары Пятроўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БРАТА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў бухгалтэрыі выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму бухгалтару **ІГНАЦЕНКА Людміле Уладзіміраўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты біялагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне сакратару дэканата **КАЗАЧЭНКА Тамары Міхайлаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БРАТА.**

**1 декабря - Всемирный день профилактики СПИДа!**

# ЗНАЙТЕ ФАКТЫ О ВИЧ/СПИДе

Эпидемия СПИДа распространяется нарастающими темпами.

На земном шаре вирусом СПИДа заражено 30 млн. человек.

Одна треть — это люди от 10 до 24 лет.

В Беларуси выявлено более 2250 ВИЧ-инфицированных. Большинство из них — жители г.Светлогорска, где в июне 1996 г. началась эпидемия этой инфекции среди лиц, употребляющих наркотики путем инъекций. Заражение произошло через загрязненную кровью ВИЧ-инфицированного наркотическую жидкость и грязные общие шприцы. Последнее время идет и половой путь передачи вируса.

Главная причина распространения СПИДа — невежество и дефицит нравственности.

СПИД может стать уделом каждого, поэтому надо четко знать три пути передачи его вируса:

— при половых контактах;

— через загрязненные кровью шприцы, иглы наркоманов и наркотическую жидкость;

— от ВИЧ-инфицированной матери ребенку во время беременности, родов, при кормлении грудью.

Остерегайтесь случайных половых связей!

Избегайте половых контактов с наркоманами и другими лицами «рискованного поведения»!

Используйте презервативы для уменьшения риска заражения СПИДом!

Откажитесь от внутривенного введения наркотиков!

Имейте индивидуальные иглы и шприцы, дезинфицируйте их после использования!

Обследоваться на СПИД можно в любой поликлинике и Центре профилактики СПИДа, телефон 53-71-40.

**Гомельский областной Центр профилактики СПИДа.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 534.
Падпісана да друку 20.11.98.